# СЕКЦИЯ 5. МЕНЕДЖМЕНТ В СИСТЕМЕ ОБРАЗОВАНИЯ

## ПРАФЕСІЙНЫ РОСТ ПЕДАГОГА ЯК АБ’ЕКТ КІРАВАННЯ

***В.Я.Бартош***
***ДУА “Пінкавіцкая сярэдняя школа імя Якуба Коласа” Пінскага раёна***

Удасканаленне якасці навучання ў школе напрамую залежыць ад узроўню падрыхтоўкі педагогаў. Выхаваць творчую, самадастатковую асобу можа толькі творчы і таленавіты педагог, які ідзе па шляху самаўдасканалення і самаразвіцця.

Сістэма кіравання самаадукацыйнай дзейнасцю педагога заключаецца ў стварэнні спрыяльных умоў для арганізацыі самаадукацыі. Гэта, перш усяго, арганізацыя інфармацыйнага забеспячэння працэсу самаадукацыі. У склад гэтай дзейнасці кіраўніка ўваходзіць арганізацыя выстаў навуковай, метадычнай інфармацыі, якая неабходная педагогам. Па-другое, неабходна стварыць сістэму кіраўніцкага садзейнічання педагогам для ажыццяўлення самаадукацыйнай дзейнасці. Задача адміністрацыі школы – правільна выбраць кампаненты сістэмы павышэння прафесійнага майстэрства настаўнікаў, удакладніць іх ролю і месца, вызначыць шляхі узаемадзеяння матэрыяльна-тэхнічнага і арганізацыйна-педагагічнага забеспячэння яе развіцця.

Роля намесніка дырэктара па вучэбнай рабоце - стварыць умовы для развіцця здольнасцяў педагога, яго прафесійнай дзейнасці. Праблемныя семінары, педагагічныя саветы, пасяджэнні метадычнага савета, метадычных аб’яднанняў спрыяюць павышэнню ўзроўню самаўдасканалення.

Настаўнік павінен уключацца ў рэжым развіцця, адным з кампанентаў якога з’яўляецца працэс самаадукацыі. Самаадукацыя настаўніка ёсць неабходная ўмова прафесійнай дзейнасці педагога.

Самаразвіццё, самаўдасканаленне і самаадукацыя педагога – працэсы, асноўная мэта якіх – забяспечыць асобасны і прафесійны рост настаўніка.

Прафесійнае самаразвіццё – неад’емны кампанент падрыхтоўкі педагогаў; свядомы, мэтанакіраваны працэс павышэння ўзроўню сваёй прафесійнай кампетэнтнасці ў адпаведнасці са знешнімі сацыяльнымі



Репозиторий БрГУ

патрабаваннямі, умовамі педагагічнай працы і асабістай праграмай развіцця.

Самаадукацыя настаўніка - мэтанакіраваная пазнавальная дзейнасць, арганізаваная самой асобай, з мэтай набыцця сістэматычных ведаў у галіне педагогікі і методыкі выкладання, фарміравання індывідуальнага стылю педагагічнай дзейнасці.

Уся праца настаўніка – гэта бесперапынны пошук, які прадугледжвае самаўдасканаленне, а значыць і пастаяннае абнаўленне свайго педагагічнага і метадычнага арсеналу. Працэдура самаадукацыі не павінна насіць фармальны характар.

Каб работа па самаадукацыі ажыццяўлялася педагогамі нашай школы паслядоўна і лагічна, у школе распрацавана, узгоднена на метадычным савеце і зацверджана дырэктарам школы палажэнне аб рабоце педагогаў над індывідуальнымі метадычнымі тэмамі. Кожны настаўнік нашай школы мае пэўную тэму, над якой ён працуе ад аднаго да трох гадоў. У сувязі з гэтым праблема павінна быць сфармулявана дастаткова пэўна і з’яўляцца актуальнай.

Змест самаадукацыйнай дзейнасці педагога вызначаецца: асабістымі запатрабаваннямі і інтарэсамі педагагічных работнікаў у вобласці прафесійнага росту, метадычнай тэмай работы школы. Педагогу пры правядзенні работы над метадычнай тэмай па самаадукацыі прадстаўляецца самастойнасць у выбары зместу, форм дзейнасці, тэрмінаў выканання і справаздачнасці.

Індывідуальная метадычная дзейнасць педагога абавязкова мяркуе стварэнне пэўнага метадычнага прадукту. Таму ў асабістым плане па самаадукацыі настаўніка абавязкова запланаваны вынікі, якія павінны быць дасягнутымі за пэўны тэрмін.

У выніку мэтанакіраванай работы педагогаў над тэмай па самаадукацыі адбываецца павышэнне прафесійнага і навукова-метадычнага ўзроўню педагагічных кадраў, забеспячэнне аператыўнага валодання педагогамі дасягненнямі сучаснай педагагічнай навукі і інавацыйнай практыкі. Педагогі вывучаюць і ўкараняюць ў практыку перадавы педагагічны вопыт, новыя дасягненні педагагічнай, псіхалагічнай навукі, новыя тэхналогіі.

Як вынік - стварэнне банка метадычных знаходак, прэзентацыя матэрыялаў на ярмарках педагагічнага вопыту, друкаванне артыкулаў у прадметных часопісах, выступленні на фестывалях педагагічнага майстэрства, распрацоўка новых шляхоў і сродкаў педагагічнай дзейнасці, падрыхтоўка выстаў, семінараў, майстар-класаў; выпрацоўка метадычных рэкамендацый, правядзенне адкрытых урокаў і пазакласных мерапрыемстваў, стварэнне комплексу педагагічных распрацовак.



Репозиторий БрГУ

У сваёй рабоце з мэтай комплекснай ацэнкі педагагічнага майстэрства настаўнікаў я карыстаюся інфармацыйнымі картамі прафесійнага росту педагогаў, дзе адлюстроўваю выніковасць дзейнасці настаўніка на працягу некалькіх гадоў па такіх напрамках, як адукацыйны працэс і метадычная работа. Пры дапамозе інфармацыйнай карты вызначаецца ўзровень актыўнасці ўдзелу педагога ў навукова-даследчай і метадычнай дзейнасці, выніковасць удзелу навучэнцаў у рэспубліканскай алімпіядзе па вучэбных прадметах, змяшчаюцца звесткі аб наяўнасці публікацый у перыядычным друку, выступленнях настаўніка на канферэнцыях, семінарах, наяўнасць узнагарод аддзела (упраўлення) па адукацыі і інш.

На падставе аналізу практычнай дзейнасці педагогаў школы зроблены высновы аб прынцыпах арганізацыі самаадукацыі, якія рэалізуюцца на практыцы: сістэмны падыход пры планаванні і арганізацыі самаадукацыі; паслядоўнасць і бесперапыннасць фарміравання ўменняў самаадукацыі; сувязь самаадукацыі з практычнай дзейнасцю, спалучэнне навукова-тэарэтычнай падрыхтоўкі з авалоданнем уменнямі і навыкамі, неабходнымі для педагагічнай дзейнасці; добраахвотны характар самаадукацыі, адпаведнасць зместу самаадукацыі ўзроўню падрыхтоўкі настаўніка, яго інтарэсам і схільнасцям. Аднак, самае галоўнае ў рабоце па самаадукацыі педагога – гэта жаданне настаўніка працаваць над самім сабой.

Спіс выкарыстанных крыніц:

Айзенберг, А. Я. Самообразование: история, теория и современные проблемы / А. Я. Айзенберг. – М. : Высшая школа, 1986. – 233 с.

Битянова, Н. Р. Культура самосовершенствования преподавателя: учеб. пособие / Н. Р. Битянова. – М. : Международная педагогическая академия, 1994. – 132 с.

Шамова, Т.И. Менеджмент в управлении школой / Т.І.Шамова. – М.: Сфера, 1992. – 321 с.

## МЕТОДИЧЕСКАЯ РАЗРАБОТКА КАК ВИД МЕТОДИЧЕСКОЙ ПРОДУКЦИИ

***И.Н. Герасимович, методист***

Филиал учреждения образования «Брестский государственный технический университет» Пинский индустриально-педагогический колледж

На современном этапе проблема повышения качества продукции является актуальной для любого предприятия, когда в повышении эффективности производства все большее значение играет фактор «качество продукции»,